Другая частка партыйных лідэраў на чале з Т.Грыбам прытрымлівалася іншага меркавання. Яны прызнавалі неабходнасць падрыхтоўкі ўзброенага паўстання супраць акупантаў у Заходняй Беларусі. Адносна ж ССРБ гэтая плынь вырашыла застацца на пазіцыі "ўсебаковай аб'ектыўнай крытыкі бальшавіцкаму рэжыму" і дамагацца перадачы заканадаўчай улады ў краі Усебеларускаму Працоўнаму Кангрэсу, выбранаму з усёй этнаграфічнай Беларусі.

Партыйная ж група на чале з А.Трафімавым і М.Маркевічам выступіла за больш цеснае супрацоўніцтва з савецкай уладай і камуністамі, лічачы магчымым нават уваходжанне ў рады РКП(б).

Такім чынам, Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў мела ўласныя, даволі абгрунтаваныя погляды на формы і змест беларускай дзяржаўнасці. Увогуле, яна не адмаўлялася ад савецкай формы арганізацыі ўлады. Але яе ідэалам былі саветы як органы дыктатуры ўсяго працоўнага народа, аб'яднанага ў органы самакіравання, а не дыктатура пралетарыята, які да таго ж на той час складаў мізэрную меншасць насельніцтва краю. Пры гэтым нацыянальная дзяржава, ва ўяўленні белэсэраў, павінна была быць непадзельнай і ні ад каго незалежнай. Ніякія так званыя арыентацыі не маглі быць падставай яе дзяржаўнага ўладкавання.

[1] НАРБ. Ф.242, воп.1, спр.22, арк.4.
[2] Там жа. Ф.458, воп.1, спр.50, арк.50–51.
[3] Грамадзянін. 1919. 10 лют. С.2.
[4] НАРБ. Ф.242, воп.1, спр.22, арк.6.
[5] Там жа. Ф.325, воп.1, спр.169, арк.77; Грыб Т. Аб дзяржаўнай уладзе // Грамадзянін. 1919. 21 сак. С.1.
[6] Лебедзева В. Палута Бадунова // Беларуская мінуўшчына. 1994. №4. С.52.
[7] Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Ч.II. Гомель, 1993. С.174 і наст.
[8] Архіў КДБ РБ. Спр.18272-С. Т.1, арк.152.
[9] НАРБ. Ф.60, воп.3, спр.430, арк.93.
[10] Мамонька Я. На ўзломе // Спадчына. 1995. №4. С.127 і наст.
[11] На бездарожжы // Змаганне. 1920. 18 ліст.С.1; НАРБ. Ф.325, воп.1, спр.56, арк.93.

*М.А.БЯСПАЛАЯ*

## ДА ПЫТАННЯ АБ УЗДЗЕЯННІ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ВЁСКУ

Як вядома, сялянства праяўляла незадаволенасць харчразвёрсткай і савецкая ўлада вымушана была шукаць выйсце з сацыяльнага і эканамічнага крызісу, у якім апынулася краіна вясной 1921 г. Шмат напісана аб прыняцці на X з'ездзе РКП(б) новай эканамічнай палітыкі, аб яе асноўных накірунках і задачах. Паўтараць тое, што вядома яшчэ са школьнай парты, няма сэнсу, аднак хацелася б звярнуць увагу на пазіцыю вёскі ў адносінах нэпа. Тэарэтычна нэп быў задуманы як сродак выхаду з эканамічнага крызісу, а як гэта адбывалася на самой справе – сведчаць шматлікія архіўныя дакументы.

Вядома, што адным з галоўных напрамкаў нэпа стала замена харчразвёрсткі натуральным падаткам, які раскладаўся не на ўсю вёску, а на кожную асобную гаспадарку. За аснову налічэння харчпадатку бралася колькасць ворнай зямлі і едакоў у сям'і, а таксама ўраджайнасць, якая ўстанаўлівалася па ўзроўню 1917 г.

Методыка налічэння тагачаснага падатку дазваляе адзначыць некалькі момантаў. Па-першае, падатак бралі з усіх: з бедных і з багатых; па-другое, падатак быў дыферэнцыраваны; па-трэцяе, памер падатку ў геаметрычнай прагрэсіі залежаў ад эканамічнага ўзроўню гаспадаркі. У выніку атрымоўвалася, што падаткавая палітыка садзейнічала не падняццю бедных гаспадарак да ўзроўню багатых, а, наадварот, збядненню багатых. Тым самым дзяржава выбівала глебу з-пад ног у самой сябе.

За кароткі тэрмін па харчразвёрстцы сабралі 2 млн 614 тыс. пудоў збожжа, тым не менш заданне аказалася не выкананым. Па гэтай прычыне на тэрыторыі Беларусі забараняўся свабодны мясцовы абмен на падставе дэкрэта УЦВК

ад 28 сакавіка 1921 г. Харчпадатак, які ўключаў да 15 відаў прадуктаў, быў устаноўлены амаль удвая большы, у пераліку на збожжа – каля 4,5 млн пудоў. Павелічэнне тычылася толькі Беларусі, мабыць улічваўся кароткі тэрмін развёрсткі на яе тэрыторыі[1]. Аб'ём падатку быў устаноўлены яшчэ вясною, да заканчэння сяўбы, не быў прыняты пад увагу недасеў яравога палетка парадку 37%[2]. Такое фантазійнае планаванне адбывалася ў Маскве і адтуль спускалася ва ўсе мясцовасці, прычым устанаўліваўся не толькі памер падатку, а і тэрмін яго збірання.

Мясцовым органам заставалася толькі наладзіць тлумачальную работу сярод сялянства. Яна пачалася адразу пасля X з'езду, аднак можна пагадзіцца з думкаю, што "нізкі агульнаадукацыйны ўзровень вясковых камуністаў не садзейнічаў разуменню нэпа"[3]. Тое ж самае можна сказаць і пра большасць прадстаўнікоў кіруючага апарата. Недахоп ведаў вызываў іх скаванасць і спадзяванні на ўказанні зверху. Чакаць доўга не прыходзілася, таму што па кожнаму выпадку спускалася інструкцыя, як, напрыклад, тэзісы па нэпу. У адным з параграфаў гаварылася: "Замена развёрсткі з'яўляецца ўступкай сялянству з боку савецкай улады, уступкай пралетарыята вясковай гаспадарцы"[4]. Падобнае тлумачэнне абражала земляробаў, якія кармілі ўсіх, а за гэта атрымалі палягчэнне ў выглядзе харчовага падатку.

Пасля агітацыі на аснове такіх тэзісаў, безумоўна, сяляне мелі рацыю з засцярогай адносіцца да новай эканамічнай палітыкі і абвешчанага падатку. Па іншаму ўспрымаць яе не выпадала, бо дзяржава сцвярджала аб прыходзе доўгачаканага шчасця для селяніна, а сама, яшчэ не дачакаўшыся ўраджаю, ужо вызначала падатак з яго. Не выпадкова на некаторых сялянскіх канферэнцыях гучалі сцвярджэнні, што харчпадатак – толькі часовая мера з мэтаю агітацыі за пашырэнне пасеваў, сяляне не верылі, што развёрсткі больш не будзе, вылучалі ідэю аб стварэнні сялянскага саюза – абаронцы іх інтарэсаў[5]. Аднак пачуцці земляробаў ніхто ў разлік не браў. Любыя праявы незадаволенасці ўлады адносілі да кулацкай прапаганды.

На збор падаткаў мабілізоўвалася 120 камуністаў, каля 40 членаў павятовых выканкамаў і 6 адказных партработнікаў – членаў ЦВК, па паветах размяркоўваліся работнікі Наркамата харчавання. Для разбору скаргаў, якіх чакалася многа, было створана Бюро скаргаў. У распараджэнні харчовых органаў знаходзіліся падраздзяленні чырвонаармейцаў.

Нарада харчкамісараў, загадчыкаў нарыхтоўчых кантор, старшых харчовых інспектараў, якая адбылася 10 ліпеня 1921 г., ставіла задачу азнаямлення яе ўдзельнікаў з падатковымі інструкцыямі і ўзгаднення дзеянняў. Па паветах былі арганізаваны трохтыднёвыя курсы харчінспектараў. На некаторых з іх, у прыватнасці ў Слуцку, выказвалася заклапочанасць, "каб не атрымалася ў новай палітыцы тое, што атрымалася ў развёрстцы"[6].

Рашэнне аб пераходзе да харчпадатку было прынята ў сакавіку 1921 г., аднак толькі 1 чэрвеня ў паветы паступіла тэлеграма аб заканчэнні развёрсткі. У некаторых мясцовасцях, напрыклад на Случчыне, не паспелі яшчэ выканаць развёрстку на масла, яйкі, воўну, як адразу пачалі збіраць у такім жа памеры падатак.

Умовы, у якіх пачаўся пераход да новай эканамічнай палітыкі на Беларусі, аказаліся надта складанымі. У адной з тэлеграм у Маскву А.Р.Чарвякоў паведамляў: "Рэсурсы Беларусі вычарпаны, запасы харчавання забяспечаць галодны паёк да 1 ліпеня, тавараабмен зрываецца наплывам махляроў і прадстаўнікоў розных арганізацый з усімі неабходнымі дакументамі"[7]. У сувязі з гэтым кіраўніцтва рэспублікі прасіла дазволу на свабодны мясцовы абмен.

Раскачка ў падрыхтоўцы да збірання падатку цягнулася не так і доўга. 15 ліпеня 1921 г. ва ўсе рэспубліканскія наркаматы харчавання была накіравана тэлеграма за подпісам У.І.Леніна, якая адзначала "інэртнасць і неразуменне з боку мясцовых саветаў надзвычайнай важнасці харчкампаніі. Замест рэальнай работы яны засыпаюць Цэнтр просьбамі аб паніжэнні падатку, таму ўзнікае небяспека невыканання падатку па маслу і яйкам і падстава для невыканання іншых відаў падатку". Тэлеграма абавязала лічыць спагнанне

падатку баявым заданнем нарыхтоўшчыкаў, а галоўным стымулюючым і караючым органам абвяшчаўся суд рэвалюцыйнага трыбунала[8].

Збор падатку яшчэ не пачаўся, а тэлеграмай ад 22 ліпеня за подпісам Я.Адамайціса нізавыя харчовыя камісіі апавяшчаліся аб арганізацыі спецыяльных выязных харчовых сесій рэўтрыбунала. Выязная сесія фарміравалася з трох асоб – прадстаўнікоў рэўтрыбунала, ЦВК і НКХ, кандыдатуры якіх зацвярджаліся ЦБ КП(б)Б. На кожны павет ствараліся па дзве сесіі, якія мелі права весці следства і вяршыць суд над неплацельшчыкамі падатку, неправільнымі дзеяннямі супрацоўнікаў валвыканкамаў, сельсаветаў, падаткавай інспектуры[9].

Як бачна, меры прымаліся такія надзвычайныя, быццам дзяржава адкрывала баявыя дзеянні супраць сялянства. Аднак такая тактыка сустрэла глухое супраціўленне вёскі. Не дапамагалі ні мітынгі, ні лістоўкі, ні агітацыя сродкамі мастацтва. Здавалася, дзяржава павінна была б прыслухацца да настрояў вёскі, аднак яна працягвала сваю палітыку – прымусовае неабмежаванае рабаванне вёскі. Архіўныя матэрыялы яскрава адлюстроўваюць супрацьстаянне вёскі і ўлады і пераконваюць, што нэп не стаў панацэяй ад усіх вясковых праблем, як апошнім часам сцвярджаюць некаторыя навукоўцы. Здаецца, наадварот, ён паказаў вясковаму люду, што ў дзяржаўнай палітыцы яго інтарэсы амаль не ўлічваюцца, што вёска цікавіць дзяржаву толькі як аб'ект выкачвання сродкаў.

Са свайго боку сялянства аб'явіла ціхую вайну спробам паставіць пад кантроль яго гаспадарку — утойвала колькасць ворыва, жывёлы, нават у масавым парадку пазбаўлялася ад яе, завышала колькасць едакоў. На гэтых кірунках і аформілася супрацьстаянне вёскі і ўлады. За несвоечасовае і няправільнае складанне спісаў аддаваліся пад суд рэўтрыбунала старшыні сельскіх саветаў, асобныя грамадзяне, бо кіруючыя органы лічылі, што "такія адносіны да справы перашкаджаюць харчовым органам цвёрда вытрымліваць рэвалюцыйную лінію на правядзенне харчпадатку"[10].

На Случчыне 20 жніўня 1921 г. пачаліся першыя сесіі рэўтрыбунала, якія разглядзелі справы 34 чалавек. Яны былі пакараны зняволеннем ад году да трох з канфіскацыяй жывёлы. Аднак прынятыя меры мала ў чым дапамаглі выпраўленню спісаў. Пасля гэтага было падрыхтавана да суда яшчэ 17 спраў. Планаваўся выезд на месцы камісіі з землямерам для праверкі спісаў і стварэння ў кожнай воласці камісій па барацьбе з укрыццём ворыва і жывёлы. Да грамадзян, якія не збіраліся паказваць сапраўдныя памеры гаспадаркі, прадугледжваліся самыя суровыя меры пакарання, ажно да поўнай канфіскацыі маёмасці і нават да высялення за межы Беларусі[11].

У гэтую барацьбу з сялянствам уключыўся і ЦВК БССР, які 2 лістапада 1921 г. спецыяльнай пастановай абавязваў Наркамхарч прыняць тэрміновыя меры для выяўлення ўтоенай ворнай зямлі. Утоеная плошча па рашэнню рэўтрыбунала перадавалася ў дзяржаўны зямельны фонд тэрмінам да трох год. Аднак першая хваля наступлення сустрэлася з масавай незадаволенасцю вёскі, якую нельга было ліквідаваць нават такімі жорсткімі рашэннямі. Нягледзячы на ўсё сялянства Беларусі змагло ўтаіць ад уліку каля 200 тыс. дзесяцін зямлі[12].

Да выканання галоўных відаў падатку нарыхтоўшчыкі прыступілі з 21 жніўня. Аб метадах яго спагнання дастаткова яскрава сведчыць тэлеграма Я.Адамайціса, накіраваная ў гэты ж дзень у нізавыя органы: "... Паставіць усё на баявы лад, ужываць такія сродкі націску на неплацельшчыкаў, укрывацелей, старшынь сельскіх саветаў і валвыканкамаў, як права судовага і адміністрацыйнага ўздзеяння"[13].

Адносіны сялянства да падатку ў большасці выпадкаў былі негатыўнымі. Замучаным доўгаю вайною, голадам, разрухай, харчразвёрсткай, ім на самой справе не было чым плаціць падатак.

Як сведчаць шматлікія архіўныя дакументы, у кожным павеце падатак збіраўся па-рознаму, і гэта ў значнай ступені залежыла ад пазіцыі мясцовага кіраўніцтва і ўпаўнаважаных цэнтра. Здаецца, самымі рашучымі дзеяннямі

вызначаўся асобаўпаўнаважаны па Слуцкаму павету Штэрн, якому спрыялі старшыня павятовага выканкама Уладзіміраў і павятовы харчкамісар Казлас. У адной з тэлеграм апошні паведамляў: "Мною з т.Штэрнам аб`ежджаны ўсе воласці, праверана якаснасць апарата... На месцах, дзе падрыхтоўчая работа праводзіцца дрэнна, зроблены належны нажым. У адстаючыя воласці камандзіравана дапаўняльна 10 чалавек з мясцовай партшколы. Некалькі распараджэнняў райхарчкамісіі, якія насілі характар баявых загадаў, прыметна разварушылі апарат, паднялі яго на баявую дзейнасць, павялічылі працаздольнасць. Звернута самая пільная ўвага на збор падатку па маслу і яйкам..."[14].

Моцна нервавалі вёску бясконцыя змены ў разгар кампаніі тэрмінаў здачы, замена аднаго віда харчавання другім, павялічэнне норм здачы бульбы і другія спантанныя распараджэнні ўлады. З месц паведамлялі, што гэта вызвала ў сялян недавер да новай эканамічнай палітыкі, а барацьба з такімі настроямі часта бывала няўдалай[15].

Вельмі нізкай адзнакі заслугоўвае работа нарыхтоўчых кантор. Часта здаралася, што сяляне прывозілі падатак, а яго не прыймалі з-за адсутнасці спісаў. На складах самым распаўсюджаным сродкам ашуканства стала абважванне. У Койданаве, напрыклад, выдавалі вяскоўцам фальшывыя квітанцыі аб здачы падатку, збіраючы хабар золатам, за што было растраляна чацвёра работнікаў нарыхтоўчай канторы. Бачыла сялянства і вялікую безгаспадарчасць, што панавала на складах[16].

Што тычыцца рынкаў, адкрыццё якіх прадугледжвалася новай эканамічнай палітыкай, то 14 мая 1921 г. быў выдадзены дэкрэт СНК Беларусі аб свабодным абмене. Наркамат харчавання 2 ліпеня выдаў загад, які дазваляў гандляваць толькі тым, хто выканаў падаткі па маслу, яйкам, воўне, аб чым кожны селянін павінен быў мець квітанцыю. Калі ход харчкампаніі не задавальняў улады, яны прымянялі ў якасці карных мер закрыццё рынкаў у Мінскім, Мазырскім, Барысаўскім паветах[17].

Нягледзячы на прынятыя меры, падаткі ў тэрмін не здаваліся і не толькі на Беларусі, але і па ўсёй Федэрацыі. На снежань 1921 г. іх было сабрана ўдвая менш, чым на той жа час па развёрстцы, паступленне падатку было ў чатыры разы меншым, чым планавалася. Думаецца, што гэтыя паказчыкі можна лічыць пэўным адлюстраваннем незадаволенасці сялянства падаткам. Не выпадкова, ва ўсе мясцовыя органы была накіравана тэлеграма за подпісам У.І.Леніна і другіх кіраўнікоў дзяржавы з катэгарычным загадам закончыць збор хлеба ў снежні 1921 г., арганізаваўшы націск на вёску ў выглядзе харчовага двухтыднёвіка. У гэтай тэлеграме для Беларусі ўстанаўліваўся памер падатку. Кіраўніцтва рэспублікі заняло надзвычай арыгінальную пазіцыю: перад Масквою адстойвала лічбу амаль на паўтара мільёна меншую за ўстаноўленую, а паветам, каб актывізаваць збор падатку, спускала лічбу блізкую да маскоўскай[18], спадзяючыся выканаць хаця б меншую норму.

Рашаючая роля ў кампаніі 1921 г. адводзілася выязным сесіям, колькасць спраў у якіх пастаянна расла. Сялянства ўпарта ўтойвала пасяўную плошчу, мясцовыя ўлады не давалі дакладных статыстычных звестак, у выніку падатак не выконваўся. Дзяржаўны апарат і вёска супрацьстаялі адзін аднаму, аднак сіла была ў першага і гэтая акалічнасць у значнай ступені вызначыла канчатковы вынік.

Некаторыя кіраўнікі надавалі выязным сесіям не толькі застрашаючае значэнне, але і маральнае. Намеснік наркама харчавання Фрыд, напрыклад, лічыў, што "харчовыя сесіі мала ўздзейнічаюць на псіхіку мас, а носяць сухі, судовы характар". Прымаючы да ўвагі ўказанні цэнтра аб маральным уплыве на псіхалогію грамадзян, выязным сесіям прапаноўвалася "рабіць пасяджэнні адкрытыя, агітацыйныя, пастановы публікаваць шырока. Насельніцтва павінна ведаць, што ў выпадку далейшага невыканання падатку будуць прыняты больш рэпрэсіўныя меры, ажно да ўвода войск на пастой"[19].

Як бачым, падаткавая кампанія 1921 г. аказалася надзвычай складанай для ўсіх яе ўдзельнікаў. Разумелі гэта і некаторыя з адказных асоб, якія выконвалі план, а думкі мелі іншыя. Адзін з цікавейшых дакументаў, які

раскрывае псіхалагічны настрой вёскі і радавых выканаўцаў, міжвольна паказвае сутнасць савецкай сістэмы – пісьмо загадчыка інспектарскага пададдзела Барысаўскага павятовага камісарыята харчавання ад 31 кастрычніка 1921 г. мінскаму начальніку: "Калі ў цябе ёсць час і ты хочаш пазнаёміцца з сапраўдным станам работы па харчпадатку ў Барысаўскім павеце, то прачытай да канца. Ты разумееш, што ў афіцыйнай зводцы аб многіх рэчах пісаць ні ў якім выпадку нельга.

Аб настроі сялян. Афіцыйна мы ўсё пішам, што настрой большасці сялян добры, аднак фактычна гэта хлусня: настрой сялян кепскі, ды і лепшага настрою ў іх быць не можа. Селянін, як кожны чалавек, незадаволены, калі ў яго што-небудзь бяруць, але калі ў яго бяруць хлеб, да таго ж яшчэ вялікі падатак, то само сабою, што ён не можа заставацца задаволеным. Да гэтага дадай яшчэ: замест (...) 0,5 пуда насення — пуд, яму гавораць, што павінен плаціць 9 фунтаў мяса, а прымаюць па 22 з паловаю толькі жывой вагі. Але самае галоўнае, што вызывае моцнае незадавальненне, гэта тое, што з каровы, з якой ён заплаціў падатак маслам, яшчэ патрабуюць мяса, з авечкі, з якой ён ужо адзін раз аддаў воўну, патрабуюць мяса і жывую авечку з воўнаю. Яны здзіўляюцца. Што мне адказваць? Адказвай ты. А тут яшчэ гэты падатак на хатнюю птушку і абавязкова з ворыўнай плошчы... Мы хочам гэтым падштурхнуць сялян да развядзення дамашняй птушкі, хаця я асабіста думаю, што лепшым стымулам было б даць сялянам птушку, а не забіраць у іх. Але як бы там ні было, сяляне не хочуць гэтага ведаць і з іроніяй пытаюцца — "А што мая зямля яшчэ і яйца нясе?". А цяпер будуць пытацца — "А што мая зямля птушку родзіць?".

Калі ты трохі знаёмы з настроем сёняшняй вёскі, то ведаеш, што сяляне цяпер толькі і мітынгуюць аб тым, як бы гэта з іх зусім знялі той ці іншы падатак, ці хаця б трохі паменшылі. А калі станеш гаварыць пра тое, што трэба здаваць падатак, то з усіх бакоў пачуеш — "Ведаем, ведаем, чулі ўжо. Хопіць!"[20].

Такім чынам, ёсць усе падставы канстатаваць, што неспадзявана для кіраўніцтва падаткавая кампанія 1921 г. зацягнулася да вясны 1922 г. Нельга станоўча адказаць і на пытанне аб памерах выканання падатку, бо з сялянства поўнасцю быў спагнаны падатак толькі на збожжа і алейныя культуры. Астатнія віды харчавання ў патрэбным аб'ёме вёска выканаць не змагла. Аднак дзяржава не пайшла насустрач хлебаробам і не скасавала нядоімку, тым самым эканамічна вёску не падтрымала, што вызвала прыметную незадаволенасць сялянства.

[1] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДА МВ). Ф.9, воп.1, спр.7, арк.130 зв.; ф.324, воп.1, спр.149, арк.24 зв.

[2] Стральцоў М.Я. Некаторыя пытанні падаткавай палітыкі ў беларускай вёсцы ў 1921–1925 гг. // Весці АН Беларусі. 1963. №1. С.45.

[3] Гл.: Пархімовіч М.М. Новая эканамічная палітыка ў беларускай вёсцы. На пачатку шляху // Весн. Беларус. ун-та. Сер. 3. 1991. №2. С.10.

[4] ДА МВ. Ф.323, воп.1, спр.218, арк.121.

[5] Там жа. Спр. 226, арк. 15, 22, 28.

[6] Дзяржаўны архіў Рэспублікі Беларусь (ДА РБ). Ф.43, воп.1, спр.51, арк.94, 158.

[7] Там жа. Спр.51, арк.59.

[8] ДА МВ. Ф.9, воп.1, спр.7, арк.130 зв.

[9] ДА РБ. Ф.43, воп.1, т. 2, спр. 205, арк. 1, 6, 67, 68.

[10] Там жа. Спр. 204, арк. 11, 12, 18, 19.

[11] Там жа. Арк.32, 34, 70, 92 зв.

[12] Стральцоў М.Я. Указ. сач. С.45–46.

[13] ДА РБ. Ф.43, воп.1, т.2, спр.215а, арк.18, 30.

[14] ДА РБ. Ф.43, воп.1, т.2, спр.204, арк. 32.

[15] Там жа. Арк. 67, 93.

[16] Там жа. Ф.6, воп.1, спр.178, т.2, арк.465; ф.43, воп.1, т.2, спр.213, арк.7, 9.

[17] Там жа. Ф. 43, воп.1, т.2, спр.47, арк.344.

[18] Там жа. Спр.123, арк.141, 171, 172.

[19] Там жа. Спр. 205, арк.82.

[20] Там жа. Арк.94, 95, 96.